# Хроніка мастацкіх падзей

* * *

У сярэдзіне чэрвеня ў двух залах Віцебскага мастацкага музея адкрылася выстава педагогаў мастацкіх школ Полацка і Наваполацка “Творчасць як лад жыцця”. Аўтары работ – выпускнікі мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава розных гадоў – прысвяцілі экспазіцыю 60-годдзю свайго факультэта.

Большасць работ на выставе – творы педагогаў Полацкай дзіцячай мастацкай школы. Сярод твораў алейны і акварэльны жывапіс Івана Іванова, акрылавыя палотны Таццяны Піскун, гуашы Іны Вальковай, графічныя кампазіцыі Святланы Рамашка, мастацкія фота Анастасіі Івановай, фатаграфіка Наталлі Анцімонавай. Дзіцячую мастацкую школу імя І.Ф. Хруцкага прадставілі графічныя работы Наталлі Каржыцкай, жывапісныя краявіды Ірыны Башун, батыкі Аксаны Малюшыцкай, нацюрморты Іны Шыпіла.

* * *

13-я адкрытая выстава-конкурс творчых работ навучэнцаў дзіцячых мастацкіх школ і школ мастацтваў «ПЕРСПЕКТЫВА-2020» сёлета была прысвечана 100-годдзю першай выставы творчай суполкі “Уновіс”. У гэтым годзе на выставе-конкурсе было прадстаўлена больш за 400 работ з Віцебска, Полацка (Беларусь), з гарадоў-пабрацімаў Белаярска, Смаленска (Расія), Рэзекне (Латвія) і г. Нарвы (Эстонія). Пераможцаў конкурсу ва ўсіх узроставых групах (ад 8 да 17 гадоў) вызначыла журы, сярод членаў якога былі дэкан мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава А.А. Сакалова, дацэнты кафедры выяўленчага мастацтва А.Д. Кастагрыз і М.Л. Цыбульскі.

* * *

17 ліпеня на будынку па вуліцы Леніна, 24/15, дзе ў пачатку XX стагоддзя знаходзілася 1-е Віцебскае гарадское чатырохкласнае вучылішча, была ўсталявана мемарыяльная дошка, якая паведамляе аб тым, што ў ім у 1900–1904(1905) гг. вучыліся нашы землякі, сусветнавядомыя мастак Марк Шагал і скульптар Восіп Цадкін. Аўтар дошкі – скульптар, дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Сяргей Сотнікаў.

* * *

18–19 ліпеня ў межах XXIX Міжнароднага фестываля мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” адбыўся Міжнародны конкурс майстроў традыцыйнага і сучаснага мастацкага роспісу “Фарбы нябёсаў-2020”. Сярод членаў журы былі загадчык кафедры выяўленчага мастацва Л.У. Вакар і дацэнт кафедры дэкаратыўнапрыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі Г.А. Бабровіч.

* * *

У будынку ратушы (Віцебскі абласны краязнаўчы музей) 18 ліпеня адкрылася выстава адной скульптуры дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава Сяргея Сотнікава “Раўнавага”.

* * *

28 жніўня ў Віцебскім мастацкім музеі адбылося адкрыццё юбілейнай выставы вядомай беларускай мастачкі Валянціны Ляховіч, прысвечанай яе 75-гадоваму юбілею. Валянціна Ляховіч закончыла мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1968). Вучылася ў вядомых віцебскіх мастакоў Фелікса Гумена, Івана Сталярова. Доўгі час выкладала на мастацка-графічным факультэце ВДУ імя П.М. Машэрава, падрыхавала вялікую колькасць выданых мастакоў. Сябра Беларускага саюза мастакоў з 1973 года.

Доўгі час В. Ляховіч працавала пераважна ў тэхніцы акварэлі, ствараючы рэалістычныя партрэты, пейзажы, нацюрморты. Затым у акварэльных



Репозиторий ВГУ

працах перайшла да асацыятыўна-вобразнай абстракцыі. Пазней захапілася эксперыментамі ў галіне сучаснага мастацтва, ствараючы скульптуры, інсталяцыі, арт-аб’екты ў рэчышчы так званай “смеццевай культуры”.

Ідэю назвы юбілейнай выставы мастачка запазычыла з песні Булата Акуджавы “Сіні тралейбус, апошні тралейбус...”. Цэнтральнае месца выставы займае інсталяцыя “Сіні тралейбус”. На выставе прадстаўлены і жывапісныя работы, скульптуры, а таксама шматлікія творы, выкананыя ў тэхніцы калажа.

Валянціна Ляховіч – актыўны ўдзельнік міжнародных і рэспубліканскіх мастацкіх выстаў з 1967 года. Творы мастачкі знаходзяцца ў Віцебскім абласным мастацкім музеі, Музеі Марка Шагала (Віцебск), Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Мінск, Беларусь), Полацкай карціннай галерэі (Беларусь), музеі Verenzhain (Германія), галерэі “Урбан” Сарагоса (Іспанія), у прыватных зборах Расіі, Германіі, Ізраіля, Іспаніі, Польшчы, ЗША, Францыі, Швейцарыі.

* * *

1 верасня ў фае лабараторна-тэарэтычнага корпуса Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта адкрылася выстава творчых работ студэнтаў, грамадзян КНР, якія ў розныя гады праходзілі навучанне на кафедры выяўленчага мастацтва ВДУ імя П.М. Машэрава. У экспазіцыю ўвайшлі сюжэтныя кампазіцыі, пейзажы і нацюрморты, якія выкананы ў тэхніцы алейнага жывапісу.

Репозиторий ВГУ